того времени юноша должен иметь белую кожу, румянец во всю щеку, темные глаза[8]. Для умудренных опытом мужей внешность практически не имела значения. О человеке судили по его поступкам.

Свадебный обряд мало отличался от общеевропейского, но венчание не было центральным, наиболее значимым пунктом в заключении брачного союза. Основная смысловая нагрузка – объединение с другой группой, принятие в свой круг чужого человека (напоминает столбовой свадебный обряд). Вероисповедание супругов или переход из одной веры в другую из-за заключения брака обязательно отмечаются в летописи. В заслугу обществу того времени можно поставить то, что женщина не рассматривалась как "сосуд зла". Брак считался наиболее удавшимся, если супруги жили "в великой любви"[9].

Основным видом отдыха шляхты была охота, традиции которой сохранялись почти без изменения на протяжении веков. Охота напоминала настоящий светский раут; загон и отстрел зверя был лишь одной из составляющих этого ритуала. Ехали вместе с женами и других посмотреть, и себя показать: "Князь великий Витовт просил короля Ягайло к себе, на ловлю зубра, в Беловежы". Гость приехал с женою и гостил в Вильне всю зиму. Особо отмечается, что гостей звали не на простую охоту, а на потеху[10].

В заключение отметим, что некоторые элементы так называемого кодекса чести привилегированного сословия Беларуси с течением времени почти не изменились. В XIV–начале XV в. этот кодекс только формировался, в конце XV–XVI вв. он уже представлял собой довольно устоявшийся общественный институт. Необходимая для принадлежности к привилегированному сословию "родословная", активно используемая только с XVI в., в момент юридического оформления являлась в большей степени искусственной мерой и имела целью сузить круг "конкурентов". Иметь от рождения фиксированное положение в обществе было проще, чем проявлять военную доблесть или способности на государственном поприще. Все сильнее выявлялась противоположность между традициями воспитания в духе стародавнего рыцарства, смысл которого сводился к воспоминаниям о знаменитых предках, и жизнью, ориентированной на потребление.

Происходит подмена ценностей – в начале рассматриваемого периода перед рыцарем стояла цель обороны "своих" и обеспечения себя лично средствами существования. К XVI в., когда четко выделились группы магнатов, крестьян, ремесленников, дуализм положения шляхтичей – "и не заможныя, и не халопы" – стал причиной расслоения и последующего упадка сословия.

[1] Полное собрание русских летописей (далее — ПСРЛ). М., 1975. Т.XVII. С.46.
[2] Там же. С.68.
[3] Там же. С.67–68, 81.
[4] Там же. С.19.
[5] Там же. С.41.
[6] Там же. С.30–31, 138.
[7] Статут 1588 года. (Раздел 3, Арт.40, Раздел 5, Арт.1 и т.д.).
[8] ПСРЛ. М., 1975. Т.XVII. С.96.
[9] Там же. С.97.
[10] Там же. С.151.

*А.А.ГАРБАЦКІ*

## СТАРАВЕРЧАСКАЯ БЕЛАКРЫНІЦКАЯ МІТРАПОЛІЯ І МІТРАПАЛІТ АМВРОСІЙ У ПЕРШАЙ ПАЛАВІНЕ XIX ст.

Пытанне аб стварэнні Белакрыніцкай мітраполіі мае важнае значэнне не толькі для гісторыі стараверства, але і для палітыкі Расіі таго перыяду. Роля ж мітрапаліта Амвросія ў гэты перыяд неадназначна ацэньваецца як гісторыкамі стараверства, так і гісторыкамі афіцыйнай рускай праваслаўнай царквы.

Актывізацыя палітыкі прыцяснення абаронцаў старога абраду пачалася з 1826 г. Урадавымі мерамі спачатку абмяжоўваліся, а потым і ўвогуле скасоўваліся многія іх правы і льготы. Урадавыя ўказы былі накіраваны калі не на знішчэнне стараверства, то на паступовае ўстараненне яго святарства.

Было тут і праяўленне далёка ідучай імперскай знешняй палітыкі Расіі, накіраванай на экспансію земляў Украіны; знаходжанне ж у заходніх украінскіх губернях упартых стараведаў турбавала не толькі ўрад, але і самадзержца.

Першае ўрадавае рашэнне, якое найбольш абмяжоўвала дзейнасць стараверскіх святароў, было "Аб пераходах раскольніцкіх святароў з месца на месца для выпраўлення трэб" ад 10 мая 1827 г. Камітэт Міністраў пастанавіў: "Пераходы раскольніцкім святарам для выпраўлення трэб з павета ў павет, а тым больш з губерні ў губерню рашуча забараніць; у выпадку іх пераездаў, калі не будуць мець патрэбных дакументаў, абыходзіцца з імі, як з бадзягамі"[1].

8 лістапада 1827 г. было прынята найвысачэйшая пастанова аб свяшчэнніках, якія знаходзіліся пры Рагожскіх могілках у Маскве. У гэтай пастанове гаварылася, што свяшчэннікаў, якія знаходзіліся там да гэтага часу, "пакінуць у спакоі", але наперад новых не прымаць. 4 студзеня 1834 г. быў выдадзены яшчэ адзін указ адносна Рагожскіх могілак: "Ні ў якім разе не дазваляць заставацца ў Маскве прыезжым з другіх месц раскольнікам або беглым папа́м, ні па якой прычыне не дапускаць іх да адпраўлення рэлігійных трэб і не дазваляць ім часовага знаходжання на Рагожскіх могілках"[2].

Пасля гэтай забароны стараверы звярнуліся да імператара з просьбай дазволіць ім на аснове дараваных правоў прымаць свяшчэннікаў і дыяканаў, якія прыходзяць да іх. У адказе, дадзеным урадам толькі праз тры гады, абаронцам даўніны прапаноўвалася прыняць аднаверства, прымусовае распаўсюджванне якога было тады галоўнай мэтай як урада, так і афіцыйнай праваслаўнай царквы.

Пасля такога адказу ўрада ў Маскве адбыўся з'езд уплывовых правадыроў стараверства. Ад Веткі быў састарэлы настаяцель Лаўрэнцьеўскага манастыра ігумен Сімяон. Са Старадуб'я прыехалі настаяцель Пакроўскага манастыра Рафаіл, старац і настаяцель Мікольскага манастыра Сергій, якога вельмі паважалі стараверы, а таксама старац Іпаліт.

На з'ездзе выступіў Іаан Ястрабаў. Ён прапанаваў заснаваць за мяжою архірэйскую кафедру. Яго падтрымаў ігумен Лаўрэнцьеўскага манастыра Сімяон і прапанаваў для ажыццяўлення гэтай задачы некалькі даволі вопытных манахаў, якія неаднаразова былі за мяжою і ведалі замежныя мовы. Стварэнне архірэйскай кафедры за мяжою была неабходна абаронцам даўніны для таго, каб пазбавіцца ад ціску свайго ўрада і афіцыйнай царквы.

У адказ на просьбу задунайскіх стараверaў 9 снежня 1783 г. аўстрыйскі імператар Іосіф другі дазволіў ім перасяліцца ў Букавіну. Стараверы атрымалі прывілеі: вызваляліся ад рэкруцкай пастойнай павіннасці, набывалі права судзіць сваім судом вінаватых аднаверцаў. У Аўстрыі яны былі вядомыя пад назваю "липован" ("филиппонов") і належалі да чарнобальскага толку, мелі пабудаваныя ў Белай Крыніцы цэрквы ў імя Св. Казьмы і Даміана, а таксама Міколы, сакрэтна пабудаваны манастыр і карысталіся поўнай рэлігійнай свабодай. Вызначаліся і асаблівасці ў веравучэнні: а) не пакланяліся васьміканечнаму крыжу, калі на ім не было выявы распяцця Спасіцеля; б) адмаўлялі прысягу; в) перакананa верылі ў блізкасць канца свету і запэўнівалі, быццам ведаюць сам час канчыны; г) лічылі вельмі вялікім грахом брыццё барады; д) не маліліся за цара і за ўсю царскую сям'ю па форме, вызначанай свяшчэнным Сінодам; е) не прымалі да сябе тых, хто прыходзіў з пашпартамі, а ўбачыўшы яго, ірвалі, гаворачы пры гэтым, што там пячаць антыхрыста[3].

У ліпені 1843 г. манахі Алімпій Міларадаў і Павел Васільеў звярнуліся да аўстрыйскага імператара за дазволам запрасіць у манастыр епіскапа з любой замежнай краіны, акрамя недобразычлівай Расіі. Гэтая просьба ў хуткім часе была задаволена. У Царградзе ў той час знаходзіўся грэчаскі мітрапаліт Амвросій, звольнены ад Баснійскай мітраполіі па даносу саміх туркаў. Амвросій нарадзіўся ў 1791 г. у г.Еносе. Ён быў сынам свяшчэнніка. Пасля заканчэння курса багаслоўскіх навук стаў святаром, а пасля смерці жонкі ў хуткім часе прымае манаскі пастрыг. У 1835 г. патрыярхам Рыгорам быў узведзены ў

сан мітрапаліта на Босна-сараеўскую кафедру. Як піша даследчык старавераства П.С.Смірноў: "Амвросій быў лепшым з грэчаскіх архірэяў, што знаходзіліся ў Босніі, – ён быў добры, "нелюбостяжателен", клапаціўся аб прыгнечаным народзе і дзякуючы гэтаму ўвайшоў у сутыкненне з турэцкімі ўладамі"[4]. Па іх патрабаванні ён быў адазваны ў Канстанцінопаль і стаў як і шэраг другіх архірэяў беспрацоўным "...што ледзь жылі ў асяродзі ўніжэнняў і пазбаўленняў усялякага роду"[5], адзначае П.С.Смірноў.

Ускладняла становішча Амвросія яшчэ і тое, што ён меў жанатага сына, які жыў каля яго і нідзе не працаваў. Жыццё без сродкаў існавання працягвалася пяць гадоў, а гэта не магло не выклікаць у душы Амвросія варожасці да Канстанцінопальскага царкоўнага кіраўніцтва. Таму прапанова абаронцаў старога абраду, пасля доўгіх роздумаў і неаднаразовых перамоў, была Амвросіям прынята.

Паміж упаўнаважанымі і Амвросіям было падпісана пагадненне. Мітрапаліт Амвросій Паповіч абавязаўся: прыняць стараверскую рэлігію і стаць вярхоўным пастырам над усімі духоўнымі і мірскімі людзьмі, якія былі старавeрамі; па прыбыцці ў Белакрыніцкі манастыр прыняць па хрысціянскаму абавязку духоўнага айца з мясцовых свяшчэннікаў і выконваць для далучэння да царквы тое, што будзе прапаноўваць духоўны айцец, згодна з саборным правілам святых айцоў; назначыць сабе ў намеснікі другога епіскапа з Белакрыніцкага духавенства.

Са свайго боку манастыр абавязаўся: на ўтрыманне мітрапаліта назначыць жалаванне 500 чырвонцаў у год аўстрыйскім золатам, пакуль ён будзе выконваць правілы св. айцоў і манастырскі статут. Акрамя таго, манастыр абавязаўся перавезці за свой кошт з Босніі сына мітрапаліта з жонкай, купіць ім у Белай Крыніцы ў пажыццёвае карыстанне хату са дваром і агародам. У выпадку смерці мітрапаліта манастыр абавязаўся выплаціць грашовую кампенсацыю сыну. Упаўнаважаныя кляліся мітрапаліту ў вернасці і ў выкананні падпісаных пагадненняў на св. евангеллі і цалавалі яго[6].

Адразу пасля прыбыцця ў сталіцу Аўстрыі Амвросій звярнуўся да імператара з просьбай аб атрыманні аўстрыйскага грамадзянства і заявіў аб гатоўнасці выконваць статут стараверніцкай царквы, праводзіць багаслужэнні па старажытнаму чыну. Адначасова Амвросій прад'явіў імператару грамату, атрыманую ім у 1835 г. ад архіепіскапа Канстанцінопальскага, новага Рыма і ўсяленскага патрыярха Грыгорыя, якая сведчыла аб сапраўднасці яго духоўнага сану і дазваляла яму служыць у Бешыкташскай царкве.

Імператар дазволіў Амвросію весці багаслужэнне па старадрукаваных кнігах. Разам з тым ён праз свае службы праверыў добранадзейнасць мітрапаліта. І толькі пасля атрымання здавальняючых звестак загадаў дазволіць Амвросію аўстрыйскае грамадзянства і абвясціць, што ў стараверaў ёсць свой мітрапаліт.

26 верасня 1846 г. Амвросій прыехаў з Вены ў Белакрыніцкі манастыр. Тут ён быў прыняты па звычаю і правілах святых айцоў. Амвросій пракляў свае памылкі і ерасі і прыняў старавeрства. Гэты год і лічыцца годам стварэння Белакрыніцкай мітраполіі.

У гэты час у Белакрыніцкім манастыры наспявалі кананічныя спрэчкі. Некаторыя абаронцы даўніны выказалі сумненні ў правільнасці абраду хрышчэння грэкаў, пры чым гаварылі, што Амвросій не пагружэнец, а абліванец, так як грэкі ў апошні час запазычылі гэты абрад у папістаў. Спрэчкі зайшлі так далёка, што была створана спецыяльная камісія, якая наведала радзіму мітрапаліта г.Енос. Членам камісіі быў "уставщик" Міхаіл Іваноў. У адным са сваіх лістоў у Маскву да аднаверцаў ён пісаў, што ў горадзе, дзе нарадзіўся Амвросій, і нават ва ўсёй Грэцыі няма сапраўднага трохпагружальнага хрышчэння, яны толькі апускаюцца ў ваду да плячэй, а потым з той жа купелі тройчы абліваюцца праваю рукою, а некаторыя ўвогуле толькі абліваюцца, не апускаючыся ў ваду[7].

Аднак і пасля гэтага пытанне засталося канчаткова не вырашаным. І сёння яно з'яўляецца дыскусійным нават у самім старавeрстве. Нашы

меркаванні на конт гэтага пытання: Амвросій быў запрошаны ўзначаліць Белакрыніцкую мітраполію ва ўзросце 63 гадоў. І камісія, якая наведала тады Радзіму мітрапаліта, не змагла ўжо выявіць і пацвердзіць, як хрысцілі Амвросія ў дзяцінстве. Устанавіць праўду дапамагло бы выказванне самога Амвросія ці ўспаміны яго бацькоў. Але, на жаль, ні ў гісторыкаў, ні ў архіве раскольніцкага архірэя Амвросія такіх звестак няма. Улічваючы, што продкі мітрапаліта былі святарамі, можна спадзявацца, што такія ўспаміны павінны існаваць. Бо, як правіла, у сем'ях святароў пісалася гісторыя роду.

Аднак вернемся да часоў заснавання Белакрыніцкай мітраполіі. У снежні 1847 г. мітрапаліта выклікалі ў Вену ў сувязі з прэтэнзіямі Расіі і Грэчаскага патрыярха. Сутнасць справы была наступнай.

У міністэрства ўнутраных спраў Расіі, а адтуль цару, увесь час паступалі звесткі пра тое, што папоўскія кірункі паступова збліжаюцца. Гэтая з'ява звязвалася з заснаваннем Белакрыніцкай мітраполіі. У Расіі баяліся, што замежная папоўшчына атрымала незалежную самабытную арганізацыю. Так, у маі 1847 г. з'явіўся загад расійскага імператара "Аб назіранні за зносінамі нашых раскольнікаў з замежнымі", дзе, у прыватнасці, прадпісвалася, што ў выпадках з'яўлення ў дзяржаве замежных раскольнікаў, якія прыбываюць для перамоў з расійскімі сектантамі, іншаземцаў арыштоўваць, сакрэтна праводзіць дазнанне іх шкодных задумак, дзейнічаючы згодна з існуючымі законамі[8].

Расійскія ўлады баяліся ўмацавання сувязей белакрыніцкіх старавераў з чарнігаўскімі і веткаўскімі скітамі. Чарнігаўскія стараверы і чарнігаўскія скіты ў той час адыгрывалі вялікую ролю ў грамадскім жыцці. Яны ўжо аднойчы ледзь-ледзь не разбурылі імператарскую Расію: адсюль выйшаў Емяльян Пугачоў, а цяпер – новае аб'яднанне з новымі лідэрамі. Урад ведаў, што сувязі Белай Крыніцы з Масквою ідуць праз чарнігаўскія пасады, праз Арлоўскую губерню, населеную нашчадкамі збеглых, і праз Тулу – таксама стараверскі горад.

З Тулы і Масквы ва ўсе стараверскія месцы Расіі разносіліся ідэі незадаволенасці існуючым урадам. Сярод абаронцаў старога абраду зъявіліся ідэі роўнасці, самакіравання, што палохала і кіруючыя колы праваслаўнай царквы, якая да таго часу была самым буйным феадалам, а жаданне ўплывова і самастойна ўдзельнічаць на людскія душы застаўляла апошнюю больш жорстка адносіцца да старавераў. Чарнігаўскія пасады былі прыстанішчам усіх беглых: там ішла вечная глухая вайна з кіраўніцтвам. Амаль у кожным доме былі зроблены патайныя хады і тайнікі.

Расійскі бок прад'явіў мітрапаліту Амвросію прэтэнзіі па дзевяці пунктах. Вялікае пасланне накіраваў мітрапаліту грэчаскі патрыярх. Пасланне змяшчала адкрытыя пагрозы Амвросію за яго дзейнасць і прапанову вярнуцца ў сваю епархію. Пры ўмове вяртання ў Царград яму абяцалася мітраполія.

Мітрапаліт Амвросій даў падрабязныя адказы на ўсе дзевяць расійскіх пытанняў, а патрыярху напісаў, што ён вярнуцца не можа, таму што "...пришел в Буковину по позволению самого австрийского самодержателя и не бродяжничества ради, но по призванию самого народа, не имевшего у себя духовного пастыря, которых я не хищением похитил, не отнял от кого, не внес насильно в чужое стадо, ни в чужую епархию и ниже свою покинул без вины и удалился в чужие пределы; а на моей митрополии первой еще за 5 лет прежде сей моей отлучки, кроме всякого моего порока и греха, уже определен другой пастырь противу всех священных правил; то подобало ли мне там быть, где священные правила попираются"[9].

Каб пазбегнуць канфлікту з Расіяй, аўстрыйскі імператар 22 лютага 1847 г. загадвае: Белакрыніцкую мітраполію часова закрыць, манахаў-замежнікаў выслаць на сваю Радзіму, а мясцовых адправіць у сельскія суполкі. Мітрапаліту Амвросію было забаронена вяртацца з Вены на Букавіну. Стваралася спецыяльная камісія, якая павінна была разабрацца ў сітуацыі, каб спыніць незадаволенасць Расіі. Адначасова аўстрыйскі імператар загадаў не прымаць ад Амвросія ніякіх грамат, а ў Вене дазволіў застацца толькі тыдзень. Аднак

Амвросій звярнуўся да імператара з просьбай не высылаць яго з Аўстрыі, бо ён, па-першае, мае аўстрыйскае грамадзянства, а па-другое, не мае ні сіл, ні духу вяртацца жывым у Турцыю да патрыярха.

Так адрэагавала Аўстрыя на прэтэнзіі Расіі.

Калі ж імператарская камісія прыбыла ў Белую Крыніцу з намерам закрыць манастыр, у Вене адбыўся палітычны пераварот: імператара прымусілі падпісаць адпаведныя канстытуцыйныя артыкулы, а міністра ўнутраных спраў князя Метэрніха, якога лічылі галоўным стваральнікам антыстараверскай сітуацыі, ледзь не забілі.

Аўстрыйская канстытуцыя абвясціла поўную свабоду веравызнання ўсім нацыям і народам. Белакрыніцкі манастыр працягваў сваю дзейнасць. Але ўжо без мітрапаліта Амвросія, які разам з сынам, нявесткаю і ўнукам адправіўся на вечнае пасяленне ў г.Цыль. Белакрыніцкі манастыр узначаліў яго намеснік Кірыл.

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.295, воп.1, спр.226, арк.13-адв.–14.
[2] Староверческая мысль. 1910. №2. С.77.
[3] Журавлев А.И. Полное историческое известие о древних стригольниках и новых раскольниках, так называемых старообрядцах, и их учении, делах и разногласиях. Спб., 1799. С.341.
[4] Смирнов П.С. Из истории русского раскола старообрядчества. Рязань, 1893. С.154.
[5] Там жа. С.154.
[6] Кельсиев В. Сборник правительственных сведений о раскольниках. Лондон, 1860. С.157.
[7] Архив раскольнического архиерея Амвросия. Ставрополь, 1893. С.14.
[8] Кельсиев В. Указ. зб. С.179.
[9] Там жа. С.161.

*Р.С.ЛИТВИНЕНОК*

## ПОЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОЕ ДВИЖЕНИЕ В БЕЛАРУСИ И ЛИТВЕ (конец XIX – начало XX в.)

Исторически сложилось так, что в Беларуси наряду с основной национальностью, белорусами, представлены и другие этносы. На рубеже XIX–XX вв. наиболее многочисленными и политически организованными национальными группами здесь были поляки, евреи и русские.

Численность польского населения в Беларуси и Литве к началу XX в. не превышала 5,6–6% жителей данного региона.[1] Польское население на белорусско-литовских землях оказалось довольно сплоченным и политически активным. Приверженность к своей национальной культуре и традициям усиливало в сознании поляков оппозиционность к российскому самодержавию, которое ограничивало культурно-национальную инициативу польского населения в Беларуси и Литве. В единении польского населения данного региона немаловажное значение имел и конфессийный аспект. Католиков-поляков здесь объединяла организованная и строгая церковная структура. Уровень исторического самосознания поляков являлся также важным фактором их консолидации на территории Беларуси и Литвы.

В 90-е годы XIX в. носителем польской культуры оставалась интеллигенция. Она была инициатором создания школ для обучения польскому языку. Хотя закон запрещал их деятельность, тем не менее они возникали под видом различных мастерских[2]. Школы сыграли немаловажную роль в пробуждении национального самосознания польского населения. В этот период в правительственных кругах России произошли изменения по отношению к польскому национально-культурному движению, получившие название «правительственной весны»[3]. Этим самым был дан своего рода определенный импульс активизации общественной, хозяйственной и культурной деятельности польского населения в России.

Начиная с 90-х годов XIX в. быстрыми темпами развивается польское национальное движение и на белорусско-литовских землях. В эти годы в крае начинает складываться система польских политических партий. Их деятельность приобретает значительный размах в годы первой российской революции. В этот период завершается оформление польских политических партий, которые в своих программных документах отражали наиболее сущест-